# Выстава вачыма студэнтаў

***Існаванне Бібліі як кнігі ёсць найвялікшая карысць для ўсіх людзей, калі-небудзь выпрабаванай чалавецтвам. Кожная спроба прынізіць Біблію – ёсць злачынства супраць чалавецтва.***

**Эмануіл Кант.**

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі знайшла сваё адлюстраванне незвычайная міжнародная выстава «Беларусь і Біблія». Выстава запрашала і давала магчымасць убачыць упершыню прадстаўленыя рарытэты з розных краін, якія адлюстроўваюць гісторыю самай вядомай і ўплывовай кнігі ўсіх часоў – Бібліі. Выстава арганізавана Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі сумесна з некамерцыйнай арганізацыяй «Група даследаванняў рукапісаў» (Manuscript Research Group, ЗША). Частка экспанатаў прадстаўлена з 11 дзяржаўных і прыватных калекцый ЗША, Вялікабрытаніі, Ізраіля. Да гэтай міжнародна значнай культурна-грамадскай падзеі пад кіраўніцтвам Смалянка Ганны Аляксандраўны вырашылі далучыцца і студэнты аграмеханічнага факультэта БДАТУ ў складзе 18 эт групы 3 курса.

«Мы менавіта тое пакаленне, што злучае ў сабе велізарны прагрэс навукі і тэхнікі і вечную памяць культуры і гісторыі нашай краіны, таму нам важна вяртацца да сваіх каранёў і вытокаў гісторыі» – лічаць студэнты 18 эт групы. Гэтая думка і стала асноўнай рухаючай матывацыяй наведаць выставу і падзяліцца сваімі ўражаннямі.

Выстава праходзіла ў зале «Музей кнігі», якая ўяўляе сабой два пакоі, што прапануюць акунуцца ў гісторыю Бібліі і яе падарожжа праз час, народы і краіны, а экскурсаводы дапамагаюць ўсвядоміць значнасць кожнага асобніка, прадстаўленага перад табой. Кожны экспанат дазваляе перажыць сваю частку гісторыі стварэння і шляхі яго захавання да нашых дзён. У кожнага студэнта была свая асаблівая кніга, якая больш за ўсё здзівіла і дапамагла прачуць сваё значэнне ў жыцці людзей, што ёю карысталіся. У кагосьці гэта была Першая Біблія Гутэнберга, у кагосьці тое яркае і ўзорыстае Чацвёраевангелля на армянскай мове, а ў кагосьці і зусім Індыйская тора.



На выставе мы не проста змаглі ўбачыць гэтыя бясцэнныя кнігі ўжывую, але і ўласнаручна пагартаць кніжныя працы Францыска Скарыны ў сучасным друку, а гэтак жа паспрабаваць надрукаваць першы верш з кнігі Псалмоў скарынаўскай Бібліі на рэканструкцыі друкаванага станка Гутэнберга XV стагоддзя. Несумненна, у кожнага студэнта засталіся незабыўныя адчуванні ад убачанага пасля наведвання выставы, і не важна, колькі разоў ты там бываў, яна ўсё роўна кожны раз адкрываецца па-новаму.

**Студэнты АЭФ, гр.18эт, 3 курса,**
**Старшы выкладчык Г.А. СМАЛЯНКА**